ВУЧЫМ ЧЫТАЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ



Архіпава Наталля Канстанцінаўна,
настаўнік 1-й катэгорыі
ДУА "Лятчанская базавая школа
Віцебскага раёна"

Даніч Аксана Уладзіміраўна,
загадчык кафедры дошкольнай
і пачатковай адукацыі
ВДУ імя П.М. Машэрава,
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт

Репозиторий ВГУ

Я БЕЛАРУС, МАЯ РОДНАЯ МОВА БЕЛАРУСКАЯ (В. БЫКАЎ)

Артыкул прысвечаны пошукам практычнага вырашэння праблемы хуткага і эфектыўнага фарміравання ў першакласнікаў рускамоўных школ у сельскай мясцовасці ўстойлівага навыку чытаць па-беларуску. Метадычныя прапановы зроблены па выніках эксперыментальнага даследавання, якое праводзілася ў школах Віцебскага раёна. Артыкул адрасаваны ўсім, хто зацікаўлены праблемамі методыкі выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання.

Беларуская мова ў 1-м класе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання з'яўляецца важным вучэбным прадметам. Вучэбная праграма прапануе выкладанне беларускай мовы пачынаць з вуснага курса, які структураваны ў выглядзе трох раздзелаў: "Вучымся слухаць і вымаўляць", "Вучымся слухаць і адказваць" і "Вучымся слухаць, чытаць і адказваць". Трэці раздзел прадвызначае такую лінію адукацыйнага зместу навучання, як "фарміраванне першапачатковага навыку чытання па-беларуску ў працэсе пераносу навыку чытання, набытага на ўроках навучання грамаце, адаптацыя яго на беларускамоўным матэрыяле" [1].

Аўтары падручніка "Беларуская мова. 1 клас" Н.У. Антонава і Г.А. Галяш для фарміравання навыку чытання на беларускай мове прапануюць спачатку чытаць словы, якія не адрозніваюцца ў рускай і беларускай мовах (с. 26, 28, 33), потым – словы ўласнабеларускай лексікі (с. 29, 31, 32, 35–47), а пачынаючы з урока № 23 – вучэбныя тэксты [2].

Практыка паказвае, што вучням у рускамоўных школах сельскай мясцовасці ўспрымаць і чытаць вучэбныя тэксты на беларускай мове вельмі цяжка. Паступаючы ў школу, шасцігодкі ў вёсках не ведаюць літар і не ўмеюць чытаць на рускай мове. Навык чытання на рускай мове ў іх фарміруецца не так хутка, як у гарадскіх дзетак, большасць з якіх чытаць па-руску пачынае яшчэ ў дашкольным узросце. Гэта па-першае. А па-другое – маўленне вясковых дзетак – "трасянка",

і таму сфарміраваць свядомае і беглае чытанне не на роднай мове вельмі складана. Якаснага ж пераносу навыку чытання з рускай мовы на беларускую, як прадугледжвае традыцыйная методыка, не адбываецца.

Мэта нашага артыкула – апісаць падыход, які б дазволіў хутка і эфектыўна навучыць чытаць па-беларуску першакласнікаў рускамоўных школ у сельскай мясцовасці. Для дасягнення пастаўленай мэты мы правялі шэраг мерапрыемстваў. Шматгадовае назіранне за дзейнасцю настаўнікаў, якія працуюць па традыцыйнай методыцы, паказала недастатковую эфектыўнасць такой вучэбнай дзейнасці. Як вынік, дзеці чыталі з неахвотай, неасэнсавана, з вялікай колькасцю арфаэпічных памылак. Гэта вельмі ўскладняла навучанне ў наступных класах, таму назіралася неабходнасць паспрабаваць змяніць падыход да навучання чытанню. На працягу 2014–2017 гг. у ДУА "Варонаўская сярэдняя школа Віцебскага раёна" і "Лятчанская базавая школа Віцебскага раёна" было арганізавана эксперыментальнае даследаванне паступовага фарміравання навыку чытання ў першакласнікаў з выкарыстаннем больш эфектыўных, на нашу думку, метадычных прыёмаў.

Праведзены эксперымент нам дазволіў падысці да высновы: вучыць чытаць па-беларуску хутка і эфектыўна можна, калі навучанне чытанню арганізуецца як самастойны структурны кампанент урока, пачынаючы з сярэдзіны трэцяй чвэрці. У гэты перыяд аўтары падручніка "Беларуская мова. 1 клас" прапануюць першакласнікам для чытання ўласнабеларускія словы, а мы прапанавалі яшчэ і рэдагаваныя часткі адных і тых жа мастацкіх тэкстаў (казак), якія надрукавалі па-руску і па-беларуску на адным лісце паперы. Уласнабеларускія словы ў тэксце на беларускай мове выдзелілі тлустым шрыфтам. Для таго каб зацікавіць вучняў, мы абралі спецыяльны дыдактычны матэрыял – народныя і аўтарскія казкі.

Казачны жанр, безумоўна, з'яўляецца эфектыўным сродкам фарміравання не толькі прадметных кампетэнцый (чытацкіх, літаратурна-творчых), але і метапрадметных, накіраваных на фарміраванне пазнавальных, рэгулятыўных універсальных вучэбных дзеянняў. Акрамя таго, казка – гэта цудоўны інструмент фарміравання станоўчых маральна-этычных якасцей і цвёрдай грамадзянскай пазіцыі, развіцця нацыянальнай самасвядомасці дзяцей, бо ў казках сінтэзавана ўяўленне аб уласначалавечай карціне свету, у іх закладзена захаванне і перадача нацыянальнага вопыту з пакалення ў пакаленне. Такое ўяўленне знайшло адлюстраванне ў сучаснай методыцы. Так, Н.У. Антонава і Г.А. Галяш разглядаюць казку "як сродак навучання аўдзіраванню, на падставе якога арганізуецца маўленчая дзейнасць…" [1]. Нам жа ўяўляецца, што тэксты казак – гэта яшчэ і эфектыўны сродак фарміравання такога віду маўленчай дзейнасці, як чытанне. Тэкст казкі на рускай мове мы чыталі і аналізавалі на ўроках навучання грамаце ў адпаведнасці з традыцыйнай методыкай, а з беларускім варыянтам гэтай жа казкі працавалі на ўроку беларускай мовы. Схема метадычнай работы наступная:

1) чытанне казкі настаўнікам;
2) папярэдняе чытанне выдзеленых слоў вучнямі;
3) чытанне казкі вучнямі;
4) удакладненне лексічнага значэння беларускіх слоў;
5) паўторнае чытанне вучнямі.

У якасці матэрыялу для арганізацыі такой работы мы выкарыстоўвалі наступныя рэдагаваныя намі тэксты казак, якія адпавядаюць псіхафізіялагічным асаблівасцям навучэнцаў 1-га класа.

1. ДЛИННАЯ ШЕЯ

– Давай меняться шеями? – предложил поросенок Кнопка жирафу. – Я тебе свою отдам, а ты мне – свою.

– А зачем тебе моя шея? – спросил жираф.

– Пригодится, – ответил поросенок. – С длинной шеей диктант на уроке списывать легче.

– А еще зачем?

– А еще в кино с любого места все видно.

– Ну, а еще?

– Яблоки на высоких деревьях доставать можно.

– Э-э-э, нет! – сказал Долговязик. – Такая замечательная шея мне самому нужна? *(М. Пляцковский)*.

ДОЎГАЯ ШЫЯ

– Давай мяняцца шыямі! – **прапанаваў** парсюк Кнопка жырафе. – Я табе сваю аддам, а ты мне – сваю.

– А **навошта** табе мая шыя? – спытала жырафа.

– **Спатрэбіцца,** – адказаў парсючок. – З доўгай шыяй дыктант на ўроку спісваць лягчэй.

– А яшчэ навошта?

– А яшчэ ў кіно з любога месца ўсе бачна.

– Ну, а яшчэ?

– Яблыкі з высокіх **дрэваў** можна даставаць.

– Э-э-э, не! – адказала жырафа. – Такая **выдатная** шыя мне самой **патрэбна**! *(М. Пляцкоўскі)*.

2. БИШКА

«А ну-ка, Бишка, прочти, что в книжке написано!»

Понюхала собачка книжку, да и прочь пошла. «Не мое, – говорит, – дело книги читать; я дом стерегу, по ночам не сплю, лаю, воров да волков пугаю, на охоту хожу, зайку слежу, уточек ищу – будет с меня и этого» *(К. Ушинский)*.

Репозиторий ВГУ

БІШКА

«Ну, Бішка, прачытай, што ў кніжцы напісана!»

Панюхаў сабачка кніжку, ды і **прэч** пайшоў. «Не мая, – **кажа,** – **справа** кнігі чытаць; я дом **вартую,** ноччу не сплю, брашу, **злодзеяў** ды ваўкоў **палохаю,** на паляванне хаджу, зайку выследжваю, **качачак шукаю** – будзе з мяне і гэтага» *(К. Ушынскі)*.

3. ПОЖАРНЫЙ

Слоненок решил стать пожарным.

Его с удовольствием приняли в пожарную команду. А дело было так...

Пришел к пожарникам и говорит:

– Возьмите меня, пожалуйста, в пожарную команду! Очень уж я хочу стать пожарником!

А пожарники и отвечают:

– Конечно, возьмем. С таким хоботом любой пожар потушить не трудно *(Г. Цыферов)*.

ПАЖАРНЫ

Слонік вырашыў стаць пажарным.

Яго з **задавальненнем** узялі ў пажарную каманду. А **справа** была так…

Прыйшоў да пажарнікаў і кажа:

– Вазьміце мяне, **калі ласка,** у пажарную каманду! **Вельмі** ўжо я хачу стаць пажарнікам!

А пажарнікі і адказваюць:

– **Вядома,** возьмем. З такім хобатам любы пажар патушыць лёгка можна *(Г. Цыфераў)*.

4. ЛИС И МЫШОНОК

– Мышонок, Мышонок, отчего у тебя нос грязный?

– Землю копал.

– Для чего землю копал?

– Норку делал.

– Для чего норку делал?

– От тебя Лис прятаться.

– Мышонок, Мышонок, я тебя подстерегу!

– А у меня в норке спаленка.

– Кушать захочешь – вылезешь!

– А у меня в норке кладовочка.

– Мышонок, Мышонок, а ведь я твою норку разрою.

– А я от тебя в отнорочек – и был таков! *(В. Бианки)*.

ЛІС І МЫШАНЯ

– Мышаня, Мышаня, з-за чаго ў цябе нос **брудны?**

– Зямлю капаў.

– Для чаго зямлю капаў?

– Норку **рабіў.**

– Для чаго норку рабіў?

– Ад цябе Ліс **хавацца.**

– Мышаня, Мышаня, я цябе **падпільную!**

– А ў мяне ў норцы спальня.

– **Есці** захочаш – вылезеш!

– А ў мяне ў норцы кладовачка.

– Мышаня, Мышаня, а я ж тваю норку разрыю.

– А я ад цябе ў аднорачак – не зловіш! *(В. Біянкі)*.

5. ЛИСА И ГУСИ

Пришла однажды лиса на лужок. А на лугу были гуси. Хорошие гуси, жирные. Обрадовалась лиса и говорит:

– Вот я сейчас всех вас съем! А гуси говорят:

– Ты, лиса, добрая! Ты, лиса, хорошая, не ешь, пожалей нас!

– Нет! – говорит лиса, – не буду жалеть, всех съем! Что тут делать? Тогда один гусь говорит:

– Позволь, лиса, нам песню спеть, а потом ешь нас!

– Ну ладно, – говорит лиса, – пойте! Стали гуси все в ряд и запели:

– Га!

– Га-га!

– Га-га-га!

– Га-га-га-га!

Они и теперь поют, а лиса ждет, когда они кончат *(К. Ушинский)*.

ЛІСА І ГУСІ

Прыйшла **аднойчы** ліса на лужок. А на лузе былі гусі. **Добрыя** гусі, **тлустыя.** Узрадавалася ліса і **кажа:**

– Вось я **зараз** усіх вас з'ем! А гусі кажуць:

– Ты, ліса, добрая! Ты, ліса, харошая, **пашкадуй** нас!

– Не! – кажа лісіца, – не хачу шкадаваць, усіх з'ем! Што тут рабіць? Тады адзін гусак кажа:

– Дазволь, ліса, нам **спачатку** песню праспяваць, а потым з'еш нас!

– Ну добра, – кажа лісіца, – спявайце! Сталі гусі ўсе ў радок і заспявалі:

– Га!

– Га-га!

– Га-га-га!

– Га-га-га-га!

Яны і **зараз спяваюць,** а ліса **чакае,** калі яны скончаць *(К. Ушынскі)*.

6. ВОРОНА И РАК

Летела ворона над озером; смотрит – рак ползет: цап его! Села на вербу и думает закусить. Видит рак, что приходится пропадать, и говорит:

– Ой, ворона! Ворона! Знал я твоего отца и мать, что за славные были птицы!

– Угу! – говорит ворона, не раскрывая рта.

– И сестер и братьев твоих знал – отличные были птицы!

– Угу! – опять говорит ворона.

Репозиторий ВГУ

– Да хоть хорошие были птицы, а все же далеко до тебя.

– Ага! – крикнула ворона во весь рот и уронила рака в воду *(К. Ушинский)*.

ВАРОНА І РАК

Ляцела варона над возерам; глядзіць – рак паўзе: цап яго! Села на вярбу і думае закусіць. Бачыць рак, што давядзецца **загінуць,** і кажа:

– Ай, варона! Варона! **Ведаў** я твайго бацьку і маці, якія **цудоўныя** былі птушкі!

– Угу! – кажа варона, не раскрываючы рота.

– І сясцёр і братоў тваіх ведаў – **выдатныя** былі птушкі!

– Угу! – зноў кажа варона.

– Ды хоць **добрыя** былі птушкі, а ўсё ж далёка ім да цябе.

– Ага! – крыкнула варона ва ўвесь рот і выпусціла рака ў ваду *(К. Ушынскі)*.

7. ПЕТЯ-ПЕТУШОК

Жил-был Петя-петушок. А какой голосок у него был! Чистый, звонкий, громкий! Проснулся как-то утром петушок раньше всех. Выглянул в окошко, темно, все спят. И Солнышко ещё спит.

– Не порядок! – думает петушок.

Вскочил Петя на забор, да как закричит:

– Ку-ка-ре-ку!

Громко-громко! Звонко-звонко! Солнышко его услышало, проснулось, глазки открыло.

– Спасибо, Петя, что разбудил! – говорит Солнышко. – Заспалось я что-то.

Взошло Солнышко на небо. День начался. Все потихоньку просыпаться стали.

Спасибо Пете-петушку! *(Русская народная сказка)*.

ПЕЦЯ-ПЕЎНІК

Жыў-быў Пеця-пеўнік! А які галасок у яго быў! Чысты, звонкі, **гучны!** Прачнуўся **аднойчы** пеўнік раней за ўсіх. Выглянуў **у акенца,** цёмна, усе спяць. І Сонейка яшчэ спіць.

– Няма парадку! – думае пеўнік.

Ускочыў Пеця **на плот,** ды як закрычыць:

– Ку-ка-рэ-ку!

Гучна-гучна! Звонка-звонка! Сонейка яго **пачула,** прачнулася, вочкі **расплюшчыла.**

– **Дзякуй,** Пеця, што разбудзіў! – кажа Сонейка. – Нешта я доўга спала.

Узыйшло Сонейка на неба. Дзень пачаўся. Усё **паволі прачынацца** стала.

Дзякуй Пецю-пеўніку! *(Руская народная казка)*.

Праведзены кантрольны этап эксперыментальнай работы даказаў эфектыўнасць ужытых намі метадычных прыёмаў. Такі падыход дазволіў нам сфарміраваць навык чытання як на рускай мове, так і па-беларуску ў першакласнікаў рускамоўных школ у сельскай мясцовасці прыкладна на адным узроўні. Хуткасць чытання на абедзвюх мовах была прыблізна аднолькавай і адпаведнай нормам у большай часткі дзяцей. Такім чынам, можна лічыць, што пастаўленая мэта нашага даследвання – павысіць эфектыўнасць фарміравання навыку чытання па-беларуску першакласнікаў рускамоўных школ у сельскай мясцовасці – дасягнута.

ЛІТАРАТУРА

1. Антонава, Н.У. Беларуская мова ў 1 класе: вучэб.-метад. дапаможнік для настаўнікаў агульнаадук. устаноў з рус. мовай навучання / Н.У. Антонава, Г.А. Галяш. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 192 с.
2. Антонава, Н.У. Беларуская мова. 1 клас / Н.У. Антонава, Г.А. Галяш. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011.

Репозиторий ВГУ